View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Азарка, В.У. Малы абзац у мастацкім тэксце Кузьмы Чорнага / В.У.Азарка // Беларуская мова і літаратура. — 2000. — №1. — С. 90–98.

В. У. Азарка

# Малыя абзацы ў мастацкім тэксце Кузьмы Чорнага

На ўроках роднай мовы школьнікі павінны вучыцца якасна ўспрымаць і самастойна ствараць тэксты, адпаведныя разнастайным жыццёвым сітуацыям. Дасягненне пастаўленай мэты немагчыма без аналізу структуры і абзацавай будовы тэкстаў, без знаёмства са сродкамі тэкставай сувязі. Аўтары падручніка па беларускай мове для старэйшых класаў абмяжоўваюцца толькі агульным азнаямленнем вучняў з паняццем абзац: “Абзац — частка друкаванага або рукапіснага тэксту ад аднаго чырвонага радка да другога. Абзац складаецца з аднаго або некалькіх сказаў і характарызуецца адзінствам і адноснай закончанасцю зместу. Памер абзаца звычайна залежыць ад задумы аўтара, стылю яго апавядання, манеры выкладання думак, жанравых асаблівасцей твора” [1, с. 212].

Падкрэслім, што пры падзеле тэксту на абзацы пісьменнікі ўлічваюць як аб’ектыўныя, так і суб’ектыўныя фактары. Аб’ектыўныя фактары абумоўліваюць вылучэнне абзацаў, якія выконваюць інфармацыйна-сэнсавую функцыю. Як правіла, такія абзацы будуюцца па тэматычным прынцыпе: графічнае выдзяленне тэкставых адрэзкаў абумоўлена зменай тэмы, звязанай са зменай месца, часу і суб’ектаў дзеяння, аб’ектаў апісання, са зменай функцыянальна-сэнсавых маўленчых формаў (апісання, апавядання, разважання) і інш. Такі падзел спрашчае ўспрыняцце тэксту, бо чытач не адчувае супярэчнасці паміж сэнсам тэкставага адрэзка і яго знешнім афармленнем:

*Лес стаяў высока. Мясцовасць ішла да яго ўгору. Па гэты бок лесу, схаваная ў нізкарослых зарасніках, мінаючы каменні і ўзгоркі,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*імчалася ручаіна. Паўз яе, скрозь краем лесу, вілася добра вытаптаная сцежка. Змрок і цішыня панавалі тут.*

*Было яшчэ гадзіны дзве да вечара, сонца яшчэ толькі падыходзіла да лесу, калі на гэтай сцежцы з'явіўся чалавек. Ён быў шыракаплечы, на выгляд здаровы. Боты яго былі ў высахлай на іх зямлі. Нягледзячы на гарачыню, на ім была накінутая наапашкі жаўтаватая, злінялая салдацкая целагрэйка. Гэтая кароценькая вопратка была паношана: месцамі ўнізе ў ёй вісела, з-пад адпоратай падшыўкі, вата. Ішоў чалавек паволі, стомленай паходкай. Адразу відаць было, што гэты чалавек спрацаваны. Твар яго быў вельмі малады. Наўрад ці было яму нават дваццаць чатыры гады, у кожным разе не больш. Але дзіўная справа: ён быў апусклівы, няголены. Барада і вусы раслі няроўна і нягуста. Чалавек нёс на плячы палавіну, відаць, знойдзенай на дарозе дугі* <…> [2, т. 5, с. 90].

Графічнае аддзяленне аднаго адрэзка тэксту ад другога абумоўлена тэматычна: Кузьма Чорны пераводзіць увагу з апісання наваколля на апісанне галоўнага героя рамана — Міхала Тварыцкага. Плаўнасць гэтага пераходу падкрэслівае сэнсавая залежнасць другога абзаца ад першага, абумоўленая ўжываннем указальнага займенніка ў словазлучэнні *на гэтай сцежцы***.**

Сегментацыя тэксту на абзацы не толькі дазваляе размяжоўваць асобныя тэкставыя адрэзкі, а і пры неабходнасці падкрэслівае іх сэнсавую значнасць. Заўсёды, нават пры беглым, павярхоўным праглядзе тэксту, прыцягваюць увагу малыя абзацы аб'ёмам 1-2 радкі, асабліва калі невялікі тэкставы адрэзак падзелены на некалькі абзацаў ці малы абзац змяшчаецца аўтарам паміж двума вялікімі. Такія абзацы выконваюць ролю своеасаблівых арыенціраў, якія дапамагаюць лепш зразумець размеркаванне і арганізацыю тэкставага матэрыялу:

*Вестка аб смерці тэлефаніста дайшла ў яго вёску зімою.*

*У той дзень яго стары бацька прачнуўся рана, калі яшчэ было цёмна.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Ён паволі злез з палатак, абуўся і, уздзеўшы кажушок, пайшоў з ліхтаром у гумно дамалочваць учарашні посад жыта.*

*Распусціўшы снапы, ён прабіў іх на абодва бакі цэпам і стаў выбіраць кулі.*

*Скрозь шамятанне саломы пачуўся яму шум крокаў па снягу* [2, т. 1, с. 60].

Абзацы звязаны паміж сабой трывалай структурнай і сэнсавай сувяззю і разам уяўляюць абзацавы комплекс, прысвечаны раскрыццю адной з падтэм тэксту. Сегментацыя тэкставага адрэзка на малыя аднасказавыя абзацы дазволіла пісьменніку акцэнтаваць увагу на змесце кожнага сказа і падкрэсліць адносную самастойнасць мікратэмы.

Калі такі абзац афармляе малое тэматычнае адзінства, то ён выконвае адначасова дзве функцыі — функцыю афармлення тэмы і функцыю выдзялення:

*Вецер зганяў пакурчаныя лісткі з дрэваў — чорныя, апошнія. Дзьмуў сіверам з сініх палёў. На картапляніку ў зацішку маўчалі сабакі, коні пасталі на сена.*

*Пад вечар Юзік вучыўся калоць дровы. Юрка стаяў каля яго, залажыўшы рукі ў кішэні* [2, т. 3, с. 421].

Праз падзел на абзацы Кузьма Чорны размяжоўвае раскрыццё розных тэм: у першым абзацы апісваецца наваколле, а ў другім — дзеянні персанажаў.

Змест суседніх абзацаў-сказаў можа супастаўляцца ці супрацьпастаўляцца:

*Качагар бачыць з свайго месца чалавека з жоўтымі віламі пры самай дарозе і ківае яму галавою.*

*Чалавек глядзіць і смяецца…*

*Машыніст рвануў шнурок, і жалезны крык страсянуў туманнае поле* [2, т. 1, с. 103].

Сродкам тэкставай сувязі прыведзеных абзацаў выступае сінтаксічны паралелізм. Графічнае выдзяленне кожнага сказа паказвае на яго сэнсавую самастойнасць і акцэнтуе ўвагу на адрозненнях паміж імі: пісьменніка цікавіць, як персанажы рэагуюць на адну і тую сітуацыю. Аб’яднанне гэтых сказаў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзін абзац падкрэсліла б тое, што іх аб’ядноўвае — адзінства месца, часу і ўзаемаабумоўленасць дзеянняў.

На абзацавую будову некаторых апавяданняў Кузьмы Чорнага паўплывалі імпрэсіяністкія традыцыі: імкненні перадаць суб’ектыўныя адчуванні, мімалётныя ўражанні і настроі і адлюстраваць рэальнасць у яе рухомасці. У такіх выпадках суб’ектыўнае ўражанне мастака ад рэальных прадметаў і з’яў займае галоўнае месца і пераважае над аб’ектыўным пачаткам [3, с. 109]:

*Абшар зямлі — як мора, змрок і святло — як хвалі.*

*Дзень ідзе, паўзе з яснага поля.*

*За кіламетраў пяць горад адазваўся новаму дню. Зазваніла, загуло, абарвалося.*

*Дрэмлюць кусты, тлее вуголле. Агонь пацягнуўся ў перадсмяротнай млосці: патухне — блісне. Блісне-патухне. У кустах смяецца вада ранішнім смехам:*

*Люг-бр, люг-бр…*

*Людзі ля вогнішча гоняць ад сябе апошнюю дрымоту* [2, т. 1, с. 267-268].

Такі падзел на абзацы абумоўлены аўтарскім успрыняццем асобна схопленых уражанняў і жаданнем зрабіць кожны сказ маментальным і дакладным здымкам адчуванняў, пачуццяў лірычнага героя.

Абзац, які ўзнікае ў выніку графічнага вылучэння часткі папярэдняга тэкставага адрэзка, выконвае, акрамя інфармацыйна-размеркавальнай, яшчэ і эмфатычную функцыю (функцыю выдзялення):

*А Павал выцягнуў з паліцы кніжку і найшоў у ёй адрас свайго былога начлежніка.*

*У яго ж паперах з’явіўся новы запіс:*

*“Зусім знішчыць быльнікавы межы”…*

*У наступныя ночы ў Паўлавай хаце многа гаварылі над гэтым запісам. Многа раз збіраліся яго выкасаваць. І можа сапраўды выкасуюць. І не адзін раз можа будуць яго зноў запісваць, і не адзін раз выкасоўваць.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Няважна.*

*Важна тое, што ўласнаю рукою, ад уласнай свядомасці, ён раз ужо быў утворан, гэты запіс.*

*У наступныя ночы зноў галасілі ў быльнікавых межах ваўкі; у наступныя дні зноў падымаў вецер саламяны крык на віхрастай галаве вёскі.*

*Няважна.*

*Важна тое, што ў віхрастай галаве ёсць веда:*

*“На свеце існуе тое, чалавекам створанае, чым можна заглушыць воўчыя галасы ў быльнікавых межах і саламяны крык вёскі пад ударамі буйнага ветру”* [2, т. 1, с. 172].

Выдзяленне аднаго слова ў абзац паказвае на яго сэнсавую значнасць, парушае прывычны рытм і абумоўлівае экспрэсіўнасць усяго тэкставага адрэзка.

Часам сегментацыя на абзацы выяўляе эмацыянальнасць выказвання:

*Вецер плыве, і музыка грае. Яскрава гарацць агні над горадам. Плывуць з ветрам з поля ціхія песні, ходзяць над зямлёй хмары, і імкнецца жыццё на зямлі. Гавораць людзі, носяць радасць і смутак, смяюцца і плачуць. Б’ецца з пустаты глыбіня, з-пад смутку — радасць.*

*Жыццё ты маё шырокае без краёў, глыбіня мая бяздонная!..* [2, т. 1, с. 309].

Вылучэнне сказа ў абзац дапамагае падкрэсліць экспрэсію выказвання, выразіць псіхалагічны стан аўтара, перадаць яго захапленне жыццём.

Экспрэсіўныя абзацы, як правіла, маюць свае структурныя асаблівасці (паўторы, пропускі слоў, клічную інтанацыю), якія адрозніваюць іх ад суседніх абзацаў і дазваляюць выдзеліць з кантэксту:

*Глінішчы плачуць маўклівасцю; гліна з іх ляжыць пры дарозе. І смяецца, і маўчыць, і плача, і пакутуе, і цешыцца зямля.*

*Зямля, зямля!*

*І звоны гучаць, і гром шырыцца, і цішыня ляжыць* [2, т. 1, с. 359].

Клічная інтанацыя, паўтор слова *зямля*, адметны падзел на абзацы — усё гэта ўдзельнічае ў перадачы пачуццяў лірычнага героя апавядання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У некаторых выпадках малыя абзацы вылучаюцца так, што змест наступнага часткова супадае са зместам папярэдняга ці падхоплівае яго думку:

*З густаты ночаў, над снегавой шырынёй поля, выплываюць кароткія дні.*

*Дні змрочна-белыя.*

*Ці то гэта яны, ці то гэта ўпарта няўцёкшыя сляды ночы фарбуюць далёкія істужкі неба на даляглядзе, над тонкімі абрысамі чуць прыметнага лесу, у сінявата-цёмны колер. Ён лажыцца на снег* [2, т. 1, с. 185].

Такое перакрыжаванне зместаў абзацаў з’яўляецца сродкам выражэння экспрэсіі выказвання, узмацняе яго эмацыянальную выразнасць.

У творах Кузьмы Чорнага пашыраны малыя абзацы, якія падводзяць вынік паведамлення, даюць яму ацэнку:

*Дзяніс Пляцінскі хутка выехаў з двара, а Зынга доўга сядзеў на камені каля дзвярэй і гаварыў з Рытаю..*

*Назаўтра ж ён, каб як-небудзь услужыць ёй, сам пайшоў на станцыю купіць ёй білет на чыгунку. Правёў яе, выяўляючы клопат у розных дробязях, усадзіў яе ў вагоне і доўга глядзеў услед поезду.*

*І сумна і радасна было яму аднаму ў тую ноч* [2, т. 1, с. 388].

Імкненне падкрэсліць асаблівую сэнсавую значнасць апошняга сказа абумоўлівае яго вылучэнне ў асобны абзац. На цесную сувязь паміж малым абзацам і папярэднім кантэкстам паказваюць займеннікі *яму*, *тую*.

Нярэдка пісьменнік, каб надаць адценне фінальнасці, завершанасці і падкрэсліць незваротнасць апісаных падзей, заканчвае свае творы такімі эмфатычна выдзеленымі малымі абзацамі:

*Флёрка астаўся каля Гнядога. Ён яго паставіў на ранейшае месца пры жолабе, выйшаў, набраў свежай канюшыны, паклаў у жолаб і стаў глядзець на яго. Гняды не еў. Флёрка прыўзняўся на пальчыках і пагладзіў Гнядому лоб. Гняды не еў.*

*Тады Флёрка прытуліўся тварам да белых дошак новага жолаба і горка заплакаў* [2, т. 2, с. 281].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заключны абзац апавядання характарызуецца ўсечанай структурай, залежнасцю ад кантэксту (на што паказвае займеннікавае прыслоўе тады) і рэалізуе сваё значэнне ў складзе больш буйнага фрагмента тэксту — абзацавага комплекса. Яго ж графічнае вылучэнне падкрэслівае нечаканасць выніку развіцця падзей.

Часта малы абзац сумяшчае ў сабе значэнне рэзюме і ацэнкі:

*Ідучы поплеч мяне, дзеці рвалі кветкі, а Насцечка віла з іх вянок. Каля лесу я развітаўся з дзецьмі, і яны пайшлі назад, туды, дзе за поплавам відны былі будынкі іх роднага калгаса. Уваходзячы ў лес, я азірнуўся. Тры белавалосыя галоўкі відны былі пасярод зеляніва. Сонца стаяла ўжо высока, усё цвіло і пахла.*

*Як добра і хораша!* [2, т. 2, с. 311].

На завершанасць апавядання паказвае вылучаны ў абзац клічны сказ, у якім выяўлена ацэнка душэўнага стану апавядальніка. Значэнне ацэнкі спалучаецца са значэннем выніку.

Некаторыя малыя абзацы можна назваць уводнымі, бо яны рыхтуюць наступнае разгорнутае паведамленне, коратка вызначаючы яго змест. Функцыя афармлення тэмы найбольш ярка праяўляецца ў тым выпадку, калі абзац, нярэдка абзац-сказ, адлюстроўвае змену персанажа, змену часу і месца дзеяння:

*На голаў вышэй за ўсіх мужчын стаяў там Даніель Кіралейза — самы багаты шляхціц з хутароў.*

*Доўгі, як качарга, з шырокім аплыўшым тварам і тоўстымі рыжымі вусамі, ён заўсёды стараўся выглядаць чалавекам сталым і важным. Дзеля гэтага ён суконную жакетку сваю зашпільваў усяго на два гузікі — верхні і самы сподні, а пад адтапыраную сярэдзіну грудзіны запіхаў рукавіцы або часам нават і шапку: “тоўсты чалавек зусім іначай выглядае”, — гаварыў ён аб гэтым сваёй жонцы.*

*У хутаранскай капэле ён граў на кларнеце і, лічачы гэта вельмі важным і вялікім дзелам, стараўся заўсёды ўсім гаварыць аб гэтым* [2, т. 1, с. 42].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першы аднасказавы абзац выражае закончаную думку, ён толькі называе, а не раскрывае тэму абзацавага комплекса — Даніель Кіралейза. Уводны абзац — зыходны элемент у разгортванні сюжэта, ён прадвызначае далейшую канкрэтызацыю характарыстыкі персанажа.

Абзацы могуць ажыццяўляць сувязь паміж іншымі (суседнімі) абзацамі і такім чынам выконваць злучальную функцыю. Наяўнасць такіх злучальных абзацаў дазваляе ўявіць тэкст як непарыўнае разгортванне думкі:

*Трыццаць пяць год пражыла Ганна, усякі дзень жыцця быў доўгі, як год, а гады прайшлі неўзаметку. І ніяк не прыходзіла тое светлае, на што было ў Ганны так многа надзей. І з цягам часу, з кожным годам усё больш і больш гінулі гэтыя надзеі. Цяпер яны з'яўляліся ўжо рэдка калі, прыносілі яны з сабой на момант радасць, а пасля так жа раптоўна гінулі і пакідалі пасля сябе надоўга тупое нездавальненне і смутак.*

*Ганна жыла пры брату.*

*Брат Аляксей быў сарваны цяжкаю працаю; часта, затаіўшы на твары пачуццё болю, ляжаў на палатках ніцма і маўчаў. А пасля, сярдзіты, упікаў Ганну дармаедствам, а Ганна яго шкадавала — ведала злосць хворага чалавека. Не магла толькі гэтага самага Ганна дараваць братавай жонцы. І кожны дзень плакала Ганна. Кожны дзень плакала і братава жонка ад крыкаў Аляксея, кожны дзень у хаце была калатня* [2, т. 1, с. 215].

Злучальны аднасказавы абзац аб'ядноўвае суседнія абзацы ў адзін абзацавы комплекс, прысвечаны характарыстыцы Ганны, дапамагае ўключыць у тэматычнае адзінства інфармацыю пра брата гераіні і іх узаемаадносіны, а таксама падкрэслівае непарыўнасць і цэласнасць апавядання.

Такім чынам, малыя абзацы дапамагаюць зразумець адметнасць аўтарскай арганізацыі матэрыялу, афармляюць тэму тэкставага адрэзка, рыхтуюць наступнае разгорнутае паведамленне, акцэнтуюць увагу на найбольш важных момантах у развіцці сюжэта, падкрэсліваюць экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць выказванняў, звязваюць абзацы ў абзацавым комплексе. Акрамя таго, мэтанакіраваны адрыў аднаго паведамлення ад другога і выдзяленне яго ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самастойны абзац з’яўляецца сродкам стварэння разнастайных экспрэсіўных адценняў. Знаёмства з сэнсава-функцыянальнай абумоўленасцю выдзялення абзацаў у мастацкім тэксце, на нашу думку, будзе садзейнічаць узбагачэнню тэарэтычных ведаў вучняў па беларускай мове, развіццю навыкаў лінгвістычнага аналізу мастацкага тэксту, авалоданню багаццем роднай мовы.


1. Беларуская мова: Падруч. для 10 — 11 кл. агульнаадукац. шк. з рус. мовай навучання. — Мн.: Нар. асвета, 1999.— 271 с.

2. Чорны К. Збор твораў: У 8 т. — Мн: Маст. літ., 1972 — 1975.

3. Лявонава Е. А. Нерэалістычныя плыні ў замежнай літаратуры другой паловы XIX — пачатку XX ст. // Беларуская мова і літаратура.— Вып. 2.— Мн., 1996.— С.103 — 116.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ